Інга Воюш

## Жаночы характар у творчасці Івана Мележа

Творчая постаць Івана Паўлавіча Мележа адметная не толькі для айчыннай, але і для сусветнай літаратуры. Яго Палессе адкрыла нашаму і замежнаму чытачу душу беларускага чалавека.

У сучасным літаратуразнаўстве за І. Мележам трывала замацавалася званне майстра псіхалагічнай прозы і згаданая якасць твораў слыннага майстра найбольш ярка, індывідуальна і таленавіта выявілася ў раманнай трылогіі «Палеская хроніка». Вялікая проза галоўнай кнігі адкрылася чытачу не адразу. Пісьменнік ішоў да яе праз пошукі свайго героя, праз адточванне пяра ў малых жанрах. Раннія апавяданні і аповесці пісьменніка — гэта той пласт ягонай творчасці, што выяўляе найперш асаблівасці мастацкага сталення аўтара, пошукі ім уласнае прасторы сюжэтных падзей, герояў, сярод якіх значнае месца аддадзена жаночым вобразам.

І ў гэтым сэнсе заўважым, што ў дараманнай прозе І. Мележа асаблівае месца займаюць творы, дзе жанчыны з'яўляюцца галоўнымі гераінямі. Варта, напрыклад, нагадаць апавяданні «Ноччу» (1945), «Адна» (1946), «На рацэ» (1953), «На скрыжаванні» (1954), «Спатканне за горадам» (1955). У цыкле «Гарачы жнівень» («Перад навальніцай», «Павел прыехаў», «Гарачы жнівень») адной з галоўных гераінь з'яўляецца брыгадзір Алена Гаркуша.

Не менш цікава створаны і многія эпізадычныя, але запамінальныя вобразы, такія, як старая Таквіля і гаспадыня з ранніх апавяданняў пісьменніка «Апошняя аперацыя» і «У завіруху». Дарэчы, падзел мележаўскіх герояў на галоўных і негалоўных у дадзеным выпадку дастаткова ўмоўны. Як згадвае А. Адамовіч у прадмове да 10-томнага Збору твораў пісьменніка, «кожны з персанажаў у ходзе падзей можа аказацца «ў фокусе» і нават павесці за сабой сюжэт» 1

1 Мележ І. Збор твораў. У 10-ці т. Т. 1. Апавяданні. Аповесці. — Мн.: Маст.літ., 1979. С. 14.

Тут і далей вытрымкі з гэтага выдання....

Карыстаючыся жанрава-храналагічным прынцыпам, зробім спробу прасачыць шляхі развіцця ў творчасці І. Мележа найбольш цікавых і адметных жаночых вобразаў. Прынамсі, у першым апавяданні пісьменніка «Апошняя аперацыя», што ўбачыла свет у газеце «Бугурусланская праўда» (1943), жаночыя вобразы гаспадыні, Таквілі і юнай пацыенткі доктара Бацюні яшчэ традыцыйна выконваюць «службовую» функцыю, падкрэсліваючы якасці галоўнага героя — мужчыны.

Па сюжэце, галоўны герой апавядання доктар Бацюня напачатку імкнецца абараніць сваю пацыентку, семнаццацігадовую дзяўчыну ад сепсісу. Аднак бяссільны перад цяжкай хваробай. Потым з-за наступлення ворагаў доктар вымушаны пакінуць хату, дзе кватараваў. Урэшце, зноў жа ён, Бацюня не мае магчымасці прааперыраваць параненую старую Тэклю.

Калі зрабіць спробу выявіць значэнне гаваркога прозвішча галоўнага героя апавядання, можна заўважыць, што Васіль Дзянісавіч Бацюня — абагулены мастацкі вобраз бацькі, з аднаго боку, і сына, калі мець на ўвазе ягоныя адносіны да Тэклі, з другога. Адным словам, вобраз мужчыны, які павінен быў стаць абаронцам. У той жа час семнаццацігадовая дзяўчына, якую ўрач ратаваў да вайны, і вясковая гаспадыня доктара, і цётка Тэкля — гэта ўвасабленне абараняемых дачкі і маці, пацверджаннем чаму можа служыць фінал апавядання. Тэклю, у якой немец бачыць раненую бальшавічку, Бацюня называе маткай і на запытанне, хто яна, спрабуючы паўплываць на чалавечыя пачуцці фашыста, адказвае: «Жанчына. Матка». Высокая адказнасць, віна рухае героя да апошняга, здавалася б, безнадзейнага ўчынку — спробы ўратаваць старую.

У той жа час гаспадыня ў эпізодзе развітання паказана найперш як ахвяра, аб'ект адказнасці ваеннага мужчынскага свету перад мірным, жаночым пачаткам, што разбураецца. Не маючы сілы выканаць сваё прызначэнне на зямлі — абараніць — Бацюня гіне. У гэтым, магчыма, і заключаны трагічны пафас твора.

У датуемым 1944 годам апавяданні І. Мележа «Сустрэча» ўсяго адзін жаночы персанаж — медсястра Оля. У кампазіцыйным плане вобраз гэты даволі перыферыйны, але запамінальны. Праз эмацыйную рэакцыю гераіні, яе спробу паберагчы, затуліць ад хваляванняў хворага на сэрца доктара Цулукідзе чытач апасродкавана дазнаецца пра боль усёй яго сям'і. У фінале апавядання становіцца відавочным, што з жаночым вобразам звязана галоўная думка твора, пра што сведчаць апошнія радкі: «Оля выбегла з пакоя, адчуваючы, што праз хвіліну расплачацца, як стары... Яна была рада за ўрача, за Георгія, за гэту сустрэчу, якой яна так баялася. «Хто б мог падумаць, што так будзе?.. »

Вынесены ў апошнія радкі аўтарскі імператыў па-новаму раскрывае сэнс папярэдняга аповеду: прычына шчаслівага ўздыму ў сэрцы хірурга якраз у тым галоўным, што павінен зразумець і чытач. Сыну ўрача Богам захавана самае каштоўнае — жыццё. Мірны, спачувальны падыход да чалавечага болю ўласцівы яшчэ адной гераіні Мележа — доктарцы Марыі Андрэеўне, якая ў адным з эпізодаў рамана «Мінскі напрамак» мякка і тактоўна ўгаворвае партызана пацярпець. Вобраз гэтай гераіні, як і вобраз Олі, найперш паказвае чужароднасць, недалучанасць жаночага свету да жорсткасці і антычалавечнасці вайны.

Яшчэ ў адным з ранніх твораў І. Мележа «Канец размовы» чытач сустракаецца з памочніцай машыніста Валяй. Стары пуцеец Антонік і Валя вымушаны весці на наступную станцыю ваенны эшалон з ворагамі. Немец, які пільнуе машыніста, назаляе ўсім сваімі развагамі аб фашысцкай маралі. У свядомасці Валі і Антоніка паступова спеюць планы адносна таго, каб сарваць прыбыццё цягніка на станцыю. Сітуацыю выратоўвае раптоўны налёт савецкай авіяцыі. Валі ўдаецца ўцячы, Антонік гіне.

Неспакойным характарам і нязломнаю воляйгэты жаночы вобраз нагадвае Сцепаніду з аповесці В. Быкава «Знак бяды», Дусю Валяр'янаву з ягонага ж апавядання «Жоўты пясочак». У пэўным сэнсе вобраз Валі мог бы стаць працягам вобраза Ганны Чарнушкі ў «Праўдзе вясны» і «За асакою бераг». Але І. Мележ не быў бы сабою, каб патрыятызм гераіні, чыгуначніцы, не пашырыў да больш чым ідэалагічнай думкі — а менавіта, да разумення жыцця наогул. Згадаем, да прыкладу, як стары машыніст Антонік успрымае выпакутаваны, акрэслены на індывідуальным узроўні патрыятызм сваёй спадарожніцы: «Трэба быць героем, каб не быць здраднікам... Сярэдзіны няма...» — успомніліся яму словы Валі, і ён падумаў, што ў іх была суровая праўда».

Аналізуючы творчасць Івана Мележа, Дзмітрый Бугаёў невыпадкова заўважае: «Яна (Валя — І. В.) здольна цярпліва маўчаць, спакойна пакутаваць, можна часам нават дзвіціцца яе цярплівасці. Але ці не было і так, што вытрымкі не хапала: калі ўсё, што паліла душу, <u>горача</u> прарывалася, <u>нядобрае</u>, <u>неразумнае</u>. (падкрэслена намі. — І. В.) У такую хвіліну Валю нішто не магло ні спыніць, ні спалохаць» 1

1 Бугаеў Дз. Ад апавядання да рамана. Станаўленне творчай індывідуальнасці І. Мележа. // Полымя. 1975. № 1.

Гэтая ацэнка, дарэчы, магла б быць даслоўна прыменена і да Ганны Чарнушкі, пра якую сам аўтар напіша: «Ганну не дай бог увесці ў гнеў: тады яна ў момант страціць роўнасць сваю, забудзецца на ўсё, <u>загарыцца</u> адным. <u>Гарачая, нястрымная, небяспечная</u> яна, ганарліўка Ганна!»

Пры выяўленым падабенстве, аднак, варта адзначыць, што паміж згаданымі вобразамі ёсць прынцыповае адрозненне — вобраз Валі праяўлены найперш сацыяльна, вобраз Ганны, хутчэй, інтымна-пачуццёва.

Ужо адно з першых апавяданняў І. Мележа «У завіруху», як вядома, засведчыла, што ў літаратуру прыйшоў таленавіты аўтар-псіхолаг. Зусім маладзенькі салдат Засмужац – галоўны герой апавядання – прывозіць у штаб важны пакет. Зможаны, напаўжывы ад стомы, Засмужац прыходзіць у хату да сваёй гаспадыні, збіраючыся нарэшце адпачыць. Але нечакана вайскоўцу выпадае выканаць яшчэ адно даручэнне, і хлопец моцным намаганнем волі прымушае сябе ісці. Пра псіхалагічны партрэт Засмужца ў літаратуразнаўстве напісана многа, таму звернемся да іншага сюжэтнага плану: спынімся хаця і на эпізадычным, але даволі моцным жаночым вобразе.

Як часта бывае ў І. Мележа, знешняя, бачная другараднасць жаночага персанажа кампенсуецца сэнсавай нагрузкай. У дадзеным выпадку, трапна ўжываючы антанімію, аўтар апавядання «У завіруху» дабіваецца псіхалагічнай апраўданасці жаночага вобраза і падсвядома рыхтуе чытача да драматычнага фіналу твора, хаця на апапярэдніх старонках яшчэ нічога не сведчыць пра магчымую бяду: «У хаце прыемна пахла цёплым хлебам і напаленай печкай. Салдат <u>весела</u> (тут і далей падкрэслена намі. — І. В.) прывітаўся з маладзіцай і доўга расшпільваў шынель. Замерзлыя пальцы не слухаліся. Жанчына, <u>сумна</u> сочачы за ім, паківала галавой. «Дай дапамагу...» Ад нечаканага наплыву <u>вясёласці</u> Засмужац моцна абхапіў жанчыну за стан і прыцягнуў да сябе. Маладзіца <u>нявесела</u> паглядзела на яго стрыжаную галаву, на якой спераду <u>смешна</u>, па-дзіцячаму, тырчалі вожыкам серабрыстыя валаскі, паспрабавала вызваліцца».

Гераіня апавядання з сумам прадбачыць няшчасце маладога байца, добра ўяўляючы абсяг усеагульнай бяды. Па-жаночы шчымліва яна разумее, што такое хвіліннае, настраёвае адчуванне шчасця, як у маладога Засмужца, недаўгавечнае, бо ўвогуле яно не можа быць працяглым на вайне. Маладзіца ўсёй сваёй свядомасцю як бы пранікае ў страшную сутнасць таго, што адбываецца вакол, і спачувае хлопцу. Канцэпт «хатняе», як увасабленне поўнага і неабходнага шчасця, таксама звязваецца ў творы з вобразам

гаспадыні і ўсяго таго, што вакол яе. Паводле І. Мележа, шчасце вельмі простае: застацца жыць — шчасце; быць у напаленай хаце — шчасце; цяпло і пах свежаспечанага хлеба, малака, бульбы — шчасце; чалавечы клопат — шчасце. Аўтар апавядання пакрысе малюе, мадэлюе ў творы гэтую беларускую, уладкавана хатнюю, асаблівую ўтульнасць: «Маладзіца выняла з печкі чыгунок і паставіла на стол. Запахла бульбай. Засмужцу было радасна сачыць, як над чыгунком падымаецца пара... Жанчына паставіла кубак з малаком, Засмужац сеў за стол і пачаў вячэраць». У «Подыху навальніцы» нешта падобнае чытаем і пра Апейкаву жонку, якую муж заўсёды ўспамінае з замілаваннем: «Цяпло любага чалавека, цяпло роднага дома» для гэтага героя мележаўскіх твораў, асабліва “пасля холаду, беспрытульнасці дарогі, пасля чужых канап і ўслонаў, пасля навалачы турбот” заўсёды былі шчаслівым адхланнем. Шмат агульнага ў Апейкавай Веры і гаспадыні-маладзіцы з апавядання «У завіруху» і з Жэняй Крушынскай (аповесць «Блізкае і няблізкае»). Тэма любай жанчыны і яе дома, як духоўнага прыстанішча турбуе празаіка і ў апавяданні «Такі кароткі водпуск». У цэнтры сюжэта адпушчаны ў кароткі водпуск малады салдат Васіль, які прыязджае ў родны горад. І скарыстоўвае ён гэты каштоўны час найперш для таго, каб пабачыцца з каханай. Васіля перапаўняе радасць ад магчымасці бачыць знаёмыя вуліцы, дамы, і гэтая радасць звязана з прысутнасцю тут, у горадзе, каханай дзяўчыны. Шчасце вяртання ў адабраную вайной маладосць поўніць душу героя твора, які прызнаецца каханай: «Мне ўсё роўна як шчасце — бачыць цябе, твае вочы, твае рукі...»

Мадэль прыватнага хатняга свету як жыццёвага апірышча ў неспакойным свеце, як гэта назіраецца ў Кузьмы Чорнага, а потым і ў І. Мележа, В. Быкава, цесна паяднана з фемiннай вобразнасцю і яе варыяцыямі — літаратурным вобразамі маці, жонкі, каханай. У апавяданні «Ноччу» («Салдаткіна ноч») чытач назірае, як галоўная гераіня твора Маша чакае весткі ад мужа Сямёна з фронту. Адчуванне празаікам душэўнага разладу, тонкага ўнутранага канфлікту — вельмі ўласцівая яму рыса. Гатоўнасць бязмерна трываць, цярпець, рыхтавацца да горшага, як кажуць, трымацца, прымушаюць Машу павозіць сябе годна, хаваючы не толькі ад іншых, але і ад самой сябе гнятлівыя пачуцці. На сэрцы галоўнай гераіні — ноч, яно стыне, замірае ў цемрыве дум і сумненняў без роднага чалавека: «У акно пазірае белая месячная ноч. Пас мёртвага святла ляжыць на канапе, на стале, ручніком спадае на падлогу. Ноч застыла. Не чутно ні крокаў, ні галасоў, ні гукаў, нават мароз не трашчыць. Праз шыбы бачны кавалачак сіняга неба ў халодным раўнадушным бляску шматлікіх зорак. Нерухомая бясконцая ноч». Ноч — гэта асацыяцыя з замерзлай свядомасцю гераіні; «раўнадушны бляск... зорак» за шыбамі ўвасабляе непрытульны свет адзінокай жанчыны, калі людзі адмяжоўваюцца ад яе перажыванняў на такія ж касмічныя адлегласці, як халодныя зоркі. Выбух нечаканых слёз гераіні твора — вынік напружанага ўнутранага жыцця, чакання часу, які б растапіў застылыя, замарожаныя горам пачуцці. Нечаканыя жаночыя слёзы часта ілюструюць выключна моцныя, хаця і схаваныя ад чужых вачэй перажыванні гераіні.

Своеасаблівым працягам апавядання «Ноччу» з’явіўся твор пісьменніка «Незнаёмы», дзе шчаслівы момант вяртання салдата-каханага (Сяргея) таксама звязаны са шчымлівымі жаночымі слязамі: «Пасля маці нечакана адразу засмяялася і заплакала, але Сяргей не супакойваў, а толькі пазіраў на яе і радасна ўсміхаўся». Праявы жаночай псіхалогіі, нечаканыя змены настрояў мележаўскіх гераінь паглыбляюць уяўленне чытача пра невядомы, але рэальны жаночы свет, пра яго паралельнае, побач з мужчынскім, існаванне. У абсягах разумення і асэнсавання літаратурай нацыянальнага жаночага характару І. Мележ стаіць на парозе наватарскай для ўсяго беларускага патрыярхальнага менталітэту думкі: жанчына здольна быць не толькі аб’ектам (кахання, сацыяльных змен), але і іх суб’ектам.

Апавяданне пісьменніка «Адна» ўзбагачана традыцыйнымі для беларускай літаратуры жаночымі вобразамі, сярод якіх галоўная гераіня Аня, яе сястра Арына, Арыніна дачка Лорка, маці абедзвюх сёстраў. Пакуль Ані не было дома, у вёску ўрываюцца карнікі і на вачах сяльчан расстрэльваюць старую маці за сувязь з партызанамі. Аня вяртаецца праз некалькі дзён у родную хату, дзе яе чакае страшная вестка, якую дзяўчына ўспрымае вельмі балюча. З любоўю ўспамінаючы маці, яна пакутуе. Дачку гняце не толькі характэрная для вялікага гора віна; Аня перажывае найперш з-за таго, што не змагла быць з маці ў апошнія хвіліны, не змагла пахаваць роднага чалавека. Гераіню апавядання перапаўняе прага помсты. Факт непрымання жорсткіх абставін сітуцыі ў пэўным сэнсе родніць яе са Сцепанідай В. Быкава. Але ў творы І. Мележа асобасныя матывацыі (пісьменнік разгортвае дзіцячыя ўспаміны Ані пра маці) пастулова саступаюць месца сацыяльна-ідэалагічным, так як ідэя твора галоўным чынам скіроўваецца ў плынь адлюстравання ўсенароднай барацьбы. Думаецца, што ўхіл у сацыяльную сферу дае пабочны эфект спрашчэння псіхалагічнага партрэту гераінь. Не пазбаўлена ідэалагізацыі і апавяданне І. Мележа «На рацэ». У творы раскрываецца праблема адабранай маладосці цэлага пакалення, якое перажыло фінскую вайну, раздзел Беларусі, фашысцкую навалу. І заўважым, што да галоўнай тэмы твора чытач далучаецца найперш праз

вобраз Васіліны Карпаўны Крэнь, якую апавядальнік, згодна сюжэту, сустракае на прыпынку парома. У маналогу гераіні твора відаць, як у сталым узросце яна перажывае духоўную маладосць. Вобраз Васіліны Крэнь у пэўным сэнсе пераклікаецца з вобразам гераіні апавядання «Гарачы жнівень» Алены, так як Алену таксама можна назваць жанчынай, якая не зведала сапраўднай маладосці. Аднак варта адзначыць, што абодвум вобразам з ранніх апавяданняў пісьменніка яшчэ бракуе той жыццёвай сілы і аб'ектыўнасці, якія так выразна акрэсляцца ў жаночых характарах «Палескай хронікі». Са згаданых вышэй дараманных твораў пісьменніка выпалі падзеі калектывізацыі, эпоха «вялікага пералому», і гэта, прызнаем, надае створанай Мележам рэальнасці адчуванне штучнасці, хаця развіццё дзеяння застаецца эмацыйна апраўданым, падзейна матываваным.

Што да апавядання «На скрыжаванні», то твор гэты цікавы найперш тым, што аўтарам пададзены надзвычай шчымлівы жаночы вобраз, які дазваляе чытачу уявіць разуменне пісьменнікам глыбіні сапраўднага мацярынства. Старэнькая Андрэіха прыязджае ў горад з мэтаю адшукаць свайго «непуцёвага» сына Трахіма, які ў свой час з'ехаў з роднай вёскі. Папрацаваўшы на розных работах, сын нідзе стала так і не асеў. Сэрца маці неспакойнае, і яна адпраўляецца паглядзець, як жыве яе Трахім. Але, не застаўшы хлопца дома, вырашае пайсці да яго на працу, на тое скрыжаванне, дзе сын «стаіць за рэгуліроўшчыка». Паступова пісьменнік авалодвае чытацкай увагай, дзякуючы скразному матыву глыбокага суперажывання простай вясковай жанчыне. Бо на ўсё, што адбывалася, гераіня апавядання, «... старая, з выцвілымі вачыма, у суконнай жакетцы, глядзела /.../ інакш. Яе сэрца перапаўняла адчуванне велічы бачанага — за ўсё сваё жыццё Андрэіха, можа, ніколі не была такой усцешанай, як тут. Ёй здавалася, што і пешаходы, і пасажыры ў тралейбусах, і ліпы, і вокны дамоў, і сіняе, высачэзнае неба без хмурынкі — усё глядзіць на яго, на яе Трахіма». У вобразе Андрэіхі ўжо праглядваюцца рысы вобраза Алены — маці Васіля Дзятла, асабліва калі ўлічыць, што першапачаткова Васіля аўтар называў менавіта Трахімам.

У лірыка-інтымным апавяданні «Спатканне за горадам», дзе аўтар факусуе ўвагу чытача на праблеме адказнасці ў каханні, на першы план вылучаецца праблема чалавечай маралі. З аднаго боку, пісьменнікам паказаны пакуты ад неразздзеленага пачуцця, з другога, выкрываецца псіхалогія карыслівасці. Адзін з галоўных герояў твора, Леанід Андрэевіч, свядома завязвае блізкае знаёмства з юнай Алечкай, хоць пры першай сустрэчы бачыць, што ў дзяўчыны ўжо ёсць сябар. У выніку Алечка, нават баючыся грознага бацькі, закахалася ў старэйшага за сябе жанатага мужчыну, у якога ўжо расце сын. Калі ж Алечка, зацяжарыўшы, спрабуе націснуць на каханага, той прыкрываючыся сынам, фактычна адмовіўся дзяліць адказнасць за ўчыненае. Дзяўчына застаецца адна са сваімі праблемамі, гатовая да ўсяго. Глыбіня дзявочага разумення абставін, сталенне Алечкі праз пакуты выклікаюць у чытача не толькі агіду да ўчынку Леаніда, але і нараджаюць захапленне душэўнымі якасцямі галоўнай гераіні.

Для прозы Мележа вельмі натуральна, што пісьменнік надае вялікую ўвагу інтымным пачуццям: праяўленне чалавека ў каханні найбольш яркая характарыстычная рыса ў псіхалагічным партрэце героя. Уменне бачыць сутнасць міжасобаснага канфлікту і рэалізаваць яго з усёй сілай у мастацкім слове — вагомая адметнасць мележаўскага стылю. Гэты ж канфлікт яшчэ раз, але па-новаму, выявіцца потым у шчымліва празрыстым вобразе Канапляначкі. Наогул, матывы пошукаў шчасця, альбо праблема здрады ці неразборлівасці ў каханні ўласцівы многім творам празаіка. Так, у рамане «Мінскі напрамак» урач Марыя Андрэеўна, якой не ўдалося асабістае жыццё, знаходзіць шчасце з партызанам Тураўцом. Удаву Аксінню, што засталася ў напаўразбуранай вёсцы адна з сынам, сватае падрыўнік Шашура. Аляксей Лагуновіч пасля смерці жонкі Ніны бярэ шлюб з яе сяброўкай Клавай. У аповесці І. Мележа «Блізкае і няблізкае» сардэчная дылема ўзнікае і ў Зыбіна. У Ніжнім Тагіле засталася ягоная нарачоная Надзя, а на Беларусі ў партызанскім атрадзе героя твора выратоўвае ад смерці будучая жонка Жэня. Думкі пра шчасце і маральную адказнасць перад тым, каго кахаеш, непакояць і Марціна — аднаго з герояў мележаўскага цыкла «Гарачы жнівень». На вачах Марціна пры прарыве партызанскай блакады загінула жонка Гануля. Але мінуў час, і пасля вайны Марцін, ужо старшыня калгаса, адчувае ў сабе пяшчоту да Алены Гаркушы, нечакана апынуўшыся на душэўным раздарожжы. Зноў-такі, Ганна Чарнушкава, хоць і найбліжэй да азначэння адналюбкі, на працягу ўсяго твора не раз спрабуе ўладкаваць асабістае жыццё. Спачатку з Васілём, потым з Яўхімам, з Башлыковым, з Міканорам.

Адным словам, І. Мележ дае права сваім героям, як мужчынам, так і жанчынам, шукаць сваё шчасце, памыляцца, выпраўляць памылкі, знаходзіць новае каханне, загойваць душэўныя раны. Паказваючы балючыя працэсы ў сферы чалавечых пачуццяў, аўтар не апускаецца да пустога маралізатарства, а хутчэй спачувае сваім героям. Наяўнасць моцнай інтымнай плыні дазваляе пісьменніку значна пашырыць арсенал выяўленчых сродкаў, што асабліва выразна праяўляецца ў моманты, калі пісьменнік дае права на жыццё

паўнакроўным, выразна праяўленым жаночым вобразам. Новы паварот у адлюстраванні І. Мележам беларускага жаночага характару звязаны з ваеннай тэматыкай. Характэрны для ваеннай прозы сюжэт ратавання жанчынай параненага салдата ў тыле ворага (І. Мележ «Блізкае і няблізкае», І. Шамякін «Начныя зарніцы», В. Быкаў «Кар'ер», «Сцюжа», «Вочная стаўка», І. Пташнікаў «Алімпіяда» і інш.) яшчэ раз, але ў даволі нечаканым варыянце, увасобіўся ў мележаўскім апавяданні «Што ён за чалавек». Брат Галіны Сасноўскай збіў амерыканскі самалёт, што перасёк савецкую мяжу, але быў паранены. І сястра прыязджае да ягонай жонкі адно дзеля падтрымкі братавай. Вобраз Галіны ўвабраў спрадвечныя рысы беларускай жанчыны, якая не толькі стрымана перажывае сваё гора, але і ўмее браць на свае плечы чужы клопат. І. Мележ, як ён гэта часта робіць, не расказвае падрабязнасці з жыцця Галіны ў лагеры смерці, не націскае на шкадаванне, але дазваляе чытачу самому здагадацца пра тое, што іменна давялося перажыць вывезенай у Германію жанчыне. Галіна хавае збітага амерыканскага лётчыка Давіда і па даносе свайго баўэра трапляе ў канцэнтрацыйны лагер. Пачуццё ў яе спецыфічнае, дваістае. Гэта і клопатныя думкі пра параненага амерыканцамі брата, і ціхая сімпатыя да амерыканскага народа, які звязаны ў яе свядомасці з выратаваным Давідам. З'яўленне ў творы І. Мележа вобраза лётчыка-амерыканца не толькі наватарства, але і свядомы выбар аўтара, які надзяляе лётчыка рысамі звычайнага чалавека, што трапіў у бяду. Нягледзячы на тое, што твор увогуле адпавядаў ідэалагічным канонам прозы перыяду хрушчоўскай адлігі, заўважаецца, што агульначалавечае хвалюе празаіка ў большай ступені, чым вузкапалітычнае. Творчы імператыў аўтара гучыць так: ты — чалавек, і я — чалавек, і няважна, у якой краіне мы народжаны.

Заўсёдная ўнутраная гатоўнасць да спачування і дапамогі, няздольнасць пакінуць чалавека ў бядзе, богабаязнасць — яшчэ адна характарыстычная рыса нацыянальнага жаночага вобраза Івана Мележа.

І ў гэтай сувязі цыкл «Гарачы жнівень» найбольш набліжаны да галоўнай кнігі І. Мележа — «Палескай хронікі». Тут і водгулле першаснай задумы пра аповесць аб меліярацыі (як у апавяданнях «Здарэнне», «Дадому»), і лучнасць з працоўнай напоўненасцю беларускага жыцця. Пасля перамогі аднаўляецца народная гаспадарка. Жанчыны-калгасніцы, якія засталіся без мужчын, паказаны ў час жніва. Усе яны штодзённа ўдзельнічаюць у агульнанародным подзвігу, працуючы сярпамі і на жняярцы ад цямна да цямна. «Аповесць гэтая ўвабрала ў сябе штосьці вельмі важнае з душэўнага набытку пісьменніка, звязанае найперш з душэўна-паэтычнымі адносінамі да жыцця». Так піша пра гэты твор І. Мележа вядомы даследчык прозы пісьменніка С. Андраюк. Менавіта ў гэтым творы напоўніцу разгарнулася і набыло глыбокае дыханне яго, мележаўскае, Палессе. Маючы за спіною вопыт стварэння запамінальных вобразаў палескіх жанчын такімі майстрамі слова, як Якуб Колас («На ростанях»), І. Купрын («Алеся») і інш, І. Мележ, сапраўдны знаўца людзей свайго краю, звярнуўся да яго яшчэ раз, імкнучыся раскрыць знутры глыбінны палескі характар. Алена, Насця, Маланя — палескія жанчыны, убачаныя не этнографам, не шукальнікам экзотыкі, не прыезджым, а палешуком па нараджэнню. Аўтарскае бачанне падзей — гэта бачанне былога партызана, а цяпер калгаснага старшыні Марціна. Ён па-апейкаўску глядзіць на пасляваенную рэчаіснасць і з болем бачыць, якая цяжкая доля дасталася ўчарашнім салдаткам у калгасе, спачувае ім.

Аповесць «Гарачы жнівень» — гэта жыццёвая гісторыя Насці і Паўла, Марціна і Ганны, Алены і Андрэя. Асабістае і «вытворчае» настолькі сплаўлены ў Мележа, што цяжка аддзяліць гэтыя два ўзроўні. Вобразы Насці, Лізаветы пэўным чынам перагукваюцца з вобразам Сарокі з «Палескай хронікі». Спрыт, гарачасць Насці перальюцца пазней у вобраз Ганны, але пакуль яна — Гануля, жонка Марціна, якая загінула на мужавых вачах у час прарыву блакады.

Калі ўважліва прааналізаваць аповесць «Гарачы жнівень» і чарнавыя накіды рамана «Завеі, снежань...», то можна заўважыць некаторае падабенства і ў іншым плане. Марцін і Міканор — абодва старшыні калгасаў, да таго ж абодва закаханы ў жанчын па імені Ганна, а, як вядома, лёс Ганны Чарнушкі ў апошніх раманах «Палескай хронікі» аўтар звязвае з Міканорам. У чацвёртай і пятай кнігах аўтар планаваў паказаць ваенны і пасляваенны час, а таму натуральна, што Міканор — у патэнцыі Марцін, а Ганна — Гануля. Вядома і тое, што ў абодвух тэкстах дачку Ганны Чарнушкі і Марцінавай Ганны зваць аднолькава — Галька. Праўда, напрыканцы накідаў «Палескай хронікі» аўтар мяняе гэтую дэталь, удакладніўшы, што ў Ганны трое сыноў.

Трэба аддаць належнае ўменню пісьменніка захапляцца так званымі негалоўнымі персанажамі, выкарыстоўваць нават невялікую дэталь, эпізод для раскрыцця ўнутранага свету другараднага персанажа. Асаблівае захапленне, думаецца, выклікала ў аўтара гераіня згаданай аповесці Маланя, строгая, нават крыху сярдзітая, але, па сутнасці, такая нешчаслівая ў асабістым жыцці, але мужная жанчына. Стойкасць і строгасць, у першую чаргу да сябе, уменне гэтай мележаўскай гераіні змагацца са стомаю і абставінамі ўласцівая і Аўдоцці Шабунісе («Мінскі напрамак»), што выводзіць дзяцей з блакады, і маці Зыбіна («Блізкае і

няблізкае»). Думаецца, аднак, што не сама строгасць, а хутчэй духоўная нязломнасць, загартаванасць у цяжкіх жыццёвых абставінах імпануе аўтару ў духоўным вобліку гэтых жанчын.

Пры змяшчэнні ў зборніку «Гарачы жнівень» аповесць невыпадкова мела назву «У адной сям'і». Для Мележа праблема сямейнасці, агульнага калгаснага клопату застаецца актуальнай і пры напісані «Хронікі». Прынамсі, пісьменнік неаднаразова зазначае, што першыя куранёўскія калгаснікі рабілі, дапамагалі адно аднаму, як тыя сямейнікі. І вялікая роля ў гэтай сям'і надавалася бацьку — старшыні. Ідэал бацькі-працаўніка Мележ якраз бачыць не ў Міканоры, а ў селяніне-заможніку. «Былі і такія заможнікі, — думае Апейка, — дзе дастатак увесь набываўся тым, што сям'я ўся — з падрослых, працавітых дзяўчат ды хлопцаў, якімі правіць суровы, бязлітасны камандзір-бацька. Бацька-манарх, бацька-катаржнік; камандзір катаржнай каманды».

І ў пэўнай ступені жаночыя вобразы ў творах Мележа заклікаиы падкрэсліць гэтую сямейнасць, далучанасць да агульнай справы.

Галоўны герой аповесці «Блізкае і няблізкае» — тагіляк Зыбін. Аднак эмацыйны канфлікт у творы звязаны з вобразам ягонай жонкі Жэні Крушынскай. Востра пастаўленая ў творы праблема пошукаў героем сваёй Радзімы — месца, дзе жыве яго сэрца і застаецца яго каханне, адлюстравана нават і ў назве. Але «сардэчны» канфлікт тут мае свой разварот — Зыбін, маючы нявесту Надзю дома, у Тагіле, ваюе на Беларусі, і ў партызанскім атрадзе сустракае Жэню. Як і Алечка з апавядання «Спатканне за горадам», Жэня дорыць каханаму чалавеку ўвесь нерастрачаны пыл маладога кахання, маючы вельмі кволыя спадзяванні на ўзаемнасць: «Баюся я... От паедзеш ты дамоў, пабачыш там Надзю сваю. А я... а пра мяне і ўспомніць, можа, забудзешся. «С глаз долой, из сердца — вон...» Вы, мужчыны, гэта ўмееце...» — скардзіцца яна Васілю, і атрымлівае нечаканы па шчырасці адказ: «Умеем, вядома... А чаго тут — навука няхітрая». Урэшце, Жэня з горыччу ўсведамляе сваё становішча: «Палюбоўніца я, от хто!» Духоўная спустошанасць Зыбіна паступова аддаляе яго ад жонкі, працягваючы ніць пэўнага недаверу, што была завязана на самым пачатку ўзаемаадносін герояў твора. Паранены Васіль Зыбін у нечым нагадвае маладога Паўла Агеева (В. Быкаў «Кар'ер»). Прынамсі, гэты герой мележаўскага твора спачатку бянтэжыцца нават ад таго, што Жэня мацнейшая за яго, параненага: «Мне было сорамна, — кажа ён пра іх першую сустрэчу, — ляжыш, бездапаможны, як інвалід. Ну, таму і рэзкі быў, хмурны...» Затым, упэўніўшыся ў адданасці любай дзяўчыны, Васіль Зыбін пачынае рэзка мяняцца і пачуваць сябе сапраўдным гаспадаром.

Паступова ролі герояў твора акрэсліваюцца і трансфармуюцца: Зыбін перарастае ў грамадска значную асобу будаўніка новай вытворчасці, а Жэня спыняецца на ролі хатняй гаспадыні. У фінале апавядання чытача нечакана здзіўляе, што мілая, адданая Жэнечка ператвараецца ў мяшчанку, і гэта адкрываецца выпадковым зыбінскім госцем: «У жоўтай гасцінай, з распіснымі сценамі, на падлозе каля акна стаяў разгалісты фікус у вялікай драўлянай кадушцы, і жонка Зыбіна сказала, што купіла яго на рынку за 250 рублёў. «Не пераплаціла я?» — «Думаю, што не. Такі цяжка знайсці...» З адкрытай, шчырай дзяўчыны-партызанкі, якая рада была цёпламу кутку, яна раптоўна і нематывавана, адно пад уплывам высокага становішча мужа, ператвараецца ў гаспадыню зыбінскіх харомаў. Калі ж у чарговы раз паўстае пытанне аб ад'ездзе ў Тагіл, яна ўжо сумняваецца: «А можа... не паедзем, а, Вася? Нашто нам ехаць!.. Кватэра такая...» Думаецца, такая інтэрпрэтацыя пісьменнікам характару Жэні выклікана тагачаснымі ўяўленнямі пра сутнасць мяшчанства, што ўключала не толькі фетышызм у адносінах да грошай і рэчаў, але жаданне жанчыны зрабіць камфортным свой дом, стварыць у ім утульнасць, індывідуалізаваць стыль кватэры. Спроба аўтара выйсці на сацыяльна праяўленую асобу Жэні-мяшчанкі, фарсіруючы пераход ад прыватна-пачуццёвай сферы, калі гераіня адно маладая маці і адданая жонка, да грамадскай, прывяла у фінале да слаба матываванага жаночага характару. Такім чынам, ужо ў апавяданнях І. Мележ засведчыў, што ў яго творах ёсць месца сэнсава напоўненаму жаночаму вобразу, глыбока нацыянальнаму жаночаму характару. Але, вядома, асаблівага разгляду патрабуюць жаночыя вобразы «Палескай хронікі», дзе пісьменнік яшчэ бліжэй падыходзіць да разумення важнасці адлюстравання прыватнага (жаночага) свету, аб'яўляючы адзіночнае, асабістае, індывідуальнае такім жа самакаштоўным, як і грамадскае, вялікае, агульнае: «Час потым прасеяў усё, паставіў усё на сваё месца. За грандыёзнымі падзеямі, якія гісторыя ўвекавечыла для нашчадкаў, прыціхла, а часам і прапала з увагі тое, што было немаштабным і абыдзённым, хвалявала аднаго чалавека. Як бы само сабой забылася, што людзям у той час — як і ва ўсе часы — даводзілася штодня жыць абыдзённасцю; што тое дробнае, можа, нікчэмнае, на нашу думку, было для іх у аснове сваёй і важным, і вялікім, — бо без яго не было як жыць. Свет у куранёўцаў — гэта праўда — найбольш быў нешырокі, невялікі: гумно, хата, вуліца, але ў гэтым невялікім свеце было сваё вялікае: урэшце, чалавек мерыць усё мерай свайго розуму і свайго сэрца». 1

1 Мележ І. Збор твораў. У 10-ці т. Т. 6. Подых навальніцы. Раман з «Палескай хронікі». — Мн.: Маст. літ. С. 27.

Мастацкі свет галоўнай кнігі пісьменніка населены глыбокімі, па-сапраўднаму народнымі характарамі. І кожны з іх, прычым, няважна — якога, першага ці другога, плана герой тоіць у сабе патэнцыяльныя магчымасці далейшага мастацкага развіцця. Нават калі персанаж не вядзе за сабою дзеянне, яго прысутнасць адкрывае прастор творчай фантазіі чытача, вабіць у зманлівыя лабірынты чалавечай душы. Менавіта такімі, як бы асцярожліва прыадчыненымі для нас аўтарам, з'яўляюцца думкі і памкненні паляшучак. Плён шматгадовых пошукаў пісьменніка ўвасобіўся ў непаўторных вобразах дзяўчат і жанок з самай глыбізны страчанага намі цяпер прыпяцкага Палесся. Гэта — маладыя Хадоська, Ганна; прадстаўніцы старэйшага пакалення Дзятліха, Дамеціха, Глушачыха, Ганніна мачыха; яркія эпізадычныя персанажы — швачка Годля і гаспадыня Цыля, знахарка Захарыха, цётка Сарока, настаўніца Параска і Ганніна маці-нябожчыца. Паводле значэння жаночых персанажаў у развіцці сюжэтыкі і псіхалагічнага мікраклімату, вобразная палітра «Палескай хронікі» стратыфікаваная (г. зн. шматслойная, ад лац. stratum — слаі + facere — рабіць). Каларытныя жаночыя вобразы ў «Палескай хроніцы" адметныя сваёй цеснай далучанасцю да ўсіх сюжэтных перыпетый і момантаў абвастрэння эмацыянальнай напружанасці. У гэтым плане вылучым гераінь, што адносяцца альбо да інтымнай, альбо да прыватна-сямейнай, альбо да сацыяльнай сферы.

Прынамсі, у абсягі інтымнай плыні хронікі даволі выразна вызначаюцца такія вобразы, як Ганна Чарнушка, Хадоська-Канапляначка, Пракопава Маня.

Непаўторная, незабыўная Ганна... Гэта яна ўвасабляе тую скразную духоўную жаночую плынь, інтымную лінію, што звязвае ў адзін сюжэтны вузел аддаленыя па месцы і часе падзеі эпапеі. Ганна ў Куранях — дзеянне развіваецца ў вёсцы, Ганна ў Юравічах — пераносіцца ў мястэчка. Вобраз Ганны — тая нітка, з якой звязаны эпіцэнтр духоўнага напружання ў развіцці дзеяння, аб'яднанне многіх сюжэтных ліній. З'яўленне гэтай мележаўскай гераіні заўсёды лучыцца з раскрыццём яшчэ аднаго сюжэтнага феномена хронікі. Так, каханне Ганны з Васілём — гэта найперш раскрыццё Васілёвага характару; яе жыццё з Яўхімам — выяўленне духоўнага вобліку Яўхіма, безадказная Сцяпанава прыхільнасць да братавай — люстэрка Сцяпанавага характару, стоенае Апейкава пачуццё — пэўны адбітак характару Апейкі. «Апейка таксама тайна закаханы. Любуецца. «Пасляшаўся нарадзіцца!» Калі яна: «Ой, як вам падзякуваць». «Пацалуй толькі». «Усяго». Цалуе яго». Брудныя заляцанні да дзяўчыны ўпаўнаважанага таксама звязаны з выяўленнем характару Дубадзела, сакратарская ўвага да гэай мележаўскай гераіні раскрывае характар Башлыкова, шлюб з Міканорам — характар Міканора.

У другім і трэцім раманах вобраз Ганны і элемент прыватнага жыцця персанажаў страчвае цэнтральныя пазіцыі, саступаючы разгортванню сацыяльна значнага дзеяння, гістарычна-грамадскага фону. Цікава, што Ганна Чарнушка, нягледзячы на вядучыя пазіцыі гэтага персанажа ў архітэктоніцы твора, амаль не прычыняецца да галоўнай калгаснай тэмы, а вядзе за сабой як бы паралельную раманную лінію асабістых перажыванняў герояў, што таксама падаецца важным пры ставарэнні агульнай падзейнасці хронікі.

Сярод жаночых вобразаў пісьменніка Ганна стаіць асобна. Яна не проста ўвасабленне спрыту ў працы і маладосці, прадмет увагі куранёўскіх хлопцаў. Дзяўчына — натура супярэчлівая, з жывым розумам і пачуццямі. Яна — «небяспечная, гарачая, несамавітая», у яе жылах цячэ бунтарская кроў. Многія з учынкаў Ганны Чарнушкі хутчэй звяртаюць на сябе ўвагу рашучасцю і непакорлівасцю, чым разважлівасцю і паслухмянасцю. Згадаем, колькі крокаў зрабіла дзяўчына насустрач Васілю ў каханні, прычым насуперак куранёўскім звычаям: сама выклікала яго на прызнанне ля шапаткіх груш, абараняла перад непрыступным міліцыянерам Шабетам, кінулася да хлопца на вачах ва ўсёй вёскі, калі таго вялі ў Юравіцкую турму, здолела пайсці ад Глушакоў, адмовіць Башлыкову, паставіць на месца Дубадзела і, нарэшце, затуліла сабой Дзятліка, калі ў таго стрэліў Яўхім (паводле чарнавых накідаў).

Лінія кахання Ганны з Васілём не перарываецца ва ўсіх трох раманах. Сваёй адкрытасцю і спагадлівасцю Ганна ўзрушвае нязвыклае да дабрыні і шчырай увагі сэрца суседскага хлопца. Іх сустрэчы на сенажаці і ля гумна, пад грушамі, паўтараюцца з рамана ў раман, вяртаючы на кругі сапраўднага пачуцця. Пры першай сустрэчы яны радзьмухваюць вогнішча — агеньчык-сімвал свайго кахання, які ўрэшце гасне і разгараецца толькі ад вугольчыка, пазычанага ў Яўхіма. Так аўтар сімвалічна паказвае рух гісторыі іх пачуцця ў перспектыве. Наогул, Мележ часта згадвае, што каханне — гэта гарэнне, вогнішча, цяпло, вугольчык, агонь, яно грэе, пячэ, томіць, паліць сэрца. Сімвалічна, што патаемныя сустрэчы з камуністам Башлыковым, які не ўмее па-сапраўднаму кахаць, адбываюцца ўзімку, калі Ганна мерзне на начной дарозе.

Пры апісанні спаткання герояў на сенажаці ў другім рамане «Подых навальніцы» празаік выкарыстоўвае псіхалагічны прыём — паралельныя думкі Ганны і Васіля, ужывае нават сінтаксічны

паралелізм: «Калі Глушаковы калёсы выкаціліся з цёмнай, залітай вадою дарогі на зялёнае разлеглае балота, Ганна раптам няцямна павяла вачыма: вунь тое месца, дзе яны начавалі ў тую ноч. Глянула — і адразу адвярнулася, не глядзела больш туды, адно сачыла за дачушкай...» «Калі спыніліся наводдаль, блізка ад падрослага куста, у Васіля ўсярэдзіне зацеплілася салодкае, добрае і нібы зайздрослівае: «Там!.. Там было!..» Адразу, нібы зусім нядаўняе, не перажатае яшчэ, ажыў, захваляваў незвычайны настрой той незабыўнай ночы, з якой тады пачалося самае лепшае ў яго жыцці».

Ціхае няспраўджанае каханне Васіля, загнанае на самае дно душы, выяўляецца ў аўтарскім каментарыі, калі Васіль спаткаўся з ужо замужняй Ганнай каля памятных груш у «Подыху навальніцы»: «Яна ціха, як бы не верачы сабе, сказала: — Ты... ты не забыў саўсім, Вася?.. — Ён не адказаў. Дзіўныя (падкрэслена намі. — *І. В.*) пытанні часам у гэтых жанчын бываюць. Абы запытацца». Сваім разуменнем шчасця Ганна дзеліцца з Васілём: «Не век жа жыць, не любячы! Штоб любіў — тады б другое было!.. Чаго шкадаваць тых кароў, той хаты! Які ў іх толк — як церпіш толькі адзін аднаго! Любоў будзе — усё нажывецца! І не на гора — на радасць!»

Але гэтую мару Ганна разбурае ўласнымі рукамі — шукаючы зманлівага шчасця з Яўхімам, з Башлыковым, з Міканорам... Што развяло Ганну з Васілём? Ці зразумела яна да канца свайго каханага? Кінуўшы Карчоў, страціўшы дачку, Ганна апынаецца з развязанымі рукамі, а ён, хоць згодны расціць Яўхімава з Ганнай дзіця, не смее кінуць сына і сваё дзецішча — зямлю. Зямля для яго — не багацце, а нешта большае: сэнс жыцця, родная маўклівая душа. Васіль не можа выбраць шчасце паміж «або-або». І зямля — яго душа, і Ганна — яго душа. Востры і дапытлівы розум Ганны сугучны перадавым і вельмі чалавечным думкам Сцяпана, малодшага з Глушакоў. Яўхімаў брат кахае Ганну непрыкметна, ахвярна, безадказна. Аўтар перадае яму сваё захапленне гераіняй. «Не адзін раз хацелася Сцяпану дакрануцца да яе рукі, пагладзіць супакойліва, сказаць ласкавае, добрае слова! Але з гэтым лезла, вярэдзіла душу важкая вінаватасць: нядобрай, грэшнай чуў гэту неадступную ласку да братавай жонкі. Дакараў, лаяў сябе: ведаў, што грэх і здрадніцтва — ласка да Ганны, а нічога не мог зрабіць, каб з гэтай бядою ўправіцца. Аднак Ганна ніяк не паказана ў дачыненні да яго — падабаецца ёй Сцяпан ці не, злуе яна на яго, адчувае ўдзячнасць, асцерагаецца нечаканых пачуццяў? Можа, яе «адыдзі» было сказана таму, што не магла абнадзеіць яго, магла сказаць праўду...

Бачыць у Чарнушкавай дзяўчыне годнага суперніка, непрыступную вяршыню, якую трэба скарыць, і Яўхім («Людзі на балоце»). Плётка пра Ганніну сутычку з ім толькі яму на карысць. «Гавораць — дак штось е... Дыму без агню не бывае...» — сумняваецца ў Ганне нават Васіль. У сваім змаганні з чуткамі, нагаворамі, ды, зрэшты, і з самой сабою Ганна ўсё ж не адважваецца зрабіць адкрыты выклік звычаю. Яна вырашае пайсці за Яўхіма. Быццам бы не ў яе характары скарацца абставінам, але справа ў тым, што на карту пастаўлена не толькі яе добрае імя, але і спакойная старасць бацькі, дабрабыт і гонар сям'і (мачыха ведала, якія струны закрануць, калі ўгаворвала падчарку на шлюб). Да таго ж, паміж Ганнай і Яўхімам яшчэ ў малінах было як бы заключана бязмоўнае пагадненне: дзяўчына выставіла яму ультыматум — «па-добраму кеб» з ёй, а інакш — не бачыць яму «зрэбнай каралевы». Яўхім з падкрэсленым форсам «выконвае ўмовы дагавора» і на кірмашы, калі дапамагае Чарнушкам прадаць авечак, і ў час вяселля, калі воз з нявестай засеў у гразкай лужыне, і нават сам-насам з Ганнай, але ўсё гэта — да вянчання, а потым нагадвае ёй, што ўжо «забываць трэба, што нічыя была» Нельга сказаць, што паступацца сваім гонарам на вачах усіх аднавяскоўцаў было лёгка для Глушака, але ён атрымаў дастойную кампенсацыю — завалодаў аб'ектам свайго нястрымнага, звераватага і моцнага кахання. У ім, у гэтым каханні, нешта ёсць ад пачуццяў чорнаўскага Лявона Бушмара, і лёс іх пачуццяў агульны — і той, і той застаюцца самотнымі, затраўленымі жыццём. «Ён (Яўхім. — *І. В.*) як бы помсціў за тое, што не любіла, што ўпарцілася некалі. Помсціў за Васіля, за вольныя гады... І кожны вечар, кожную ноч — адно і тое ж: быць з ім, цярпець яго!..» Слухаючы думкі Ганны, чытач разумее, што віной усяму — пачуццё Яўхіма, моцнае, спапяляючае, бязладнае, неадступнае, злітае ў цвёрды сплаў з нянавісцю, што ўрэшце змушае хлопца на адчайны учынак: ён (у накідах да апошняга рамана), нямецкі паслугач, коштам свайго загубленага здрадай жыцця выпускае Ганну з фашысцкага палону.

Праўду, мабыць, казаў калісьці раз'юшаны і закаханы Яўхім пра ўласную жонку: «Як бы бог знае, дзе расла!» Ягоныя думкі з «Подыху навальніцы» паступова пераходзяць у наступны раман з «Палескай хронікі» — «Завеі, снежань...», толькі там іх выяўляе такі ж самы прагны да ўлады Башлыкоў: «Як бы там ні было, ад той сустрэчы (з Ганнай. — *І. В.*) у Глінішчах жыло ў Башлыкове неадольнае захапленне ёю, адчуванне нейкай як бы незямной завабнасці, нават нібы недаступнасці. Смешнае, хлапечае пачуццё, дзіўнае ў сталым чалавеку, адказным работніку. І вось бачыў сам, сваімі вачыма: зусім зямная, падобная да іншых, нават звычайная. Даступная (падкрэслена намі. — *І. В.*)»

І ўсё ж вонкавая станоўчасць Башлыкова розніць яго з Яўхімам, які не здраджвае свайму каханню. У той жа час, камсамольскі сакратар нават дакарае сябе: «...калі табе ўжо так захацелася жаночай ласкі, хіба мала тут дзяўчат, прыгожых і надзейных. Адданых справе, з ясным жыццём... Колькі дзяўчат камсамолак — з радасцю пайшлі б насустрач, каб ты зажадаў гэтага». Памылковая падатлівасць на розум і ласку штурхае Ганну да Башлыкова, хоць і цепліцца ў ёй разуменне гэтай памылковасці: «Ні на што мне ўсё ето, — прамовіла цвёрда, шчыра. — Да і не пара мы. Што дуб і лаза... Не дацягнешся... Каб і можно було...»

Зрэшты, надзвычай дакладна ацэньвае былога калегу Апейка: «Агню ў цябе няма на жанчын. Марны ты чалавек. Без карысці. Што за чалавек, які не ўмее любіць. Не чалавек. Ва ўсякім разе — не мужчына. Эх, я б на тваім месцы такі раман завязаў... Табе жыццё зрабіла такі падарунак. Такую жанчыну. Якую нямногім выпадае сустрэць. А ты!.. Сам адкінуў!.. З вопытам, з галавой!.. Не разумею!..»

Цягай да новага і перадавога захапляе Ганну і Міканор, але яна зноў трапляе ў пастку выхаванай гадамі звычкі быць не самой, а пры кімсьці. Міканор на працы, у турме, на вайне, на курсах, яна — дома, з дзецьмі. Гэта вельмі характэрна ў адносінах да Міканора. «Ганна — замужам за Міканорам — адчувае: не любіць яго. Спакойная. Халодны ён. Чагосьці не хапае ў яго. Увесь у справах». «Дзеці — адна радасць», — гаворыць Ганна, паўтараючы словы Ганкі з быкаўскага апавядання «Велікоднае яйка» ці брылёўскай Галі з аднайменнага твора.

У рамане «Подых навальніцы» мацярынства Ганны прапісана не дэталёва, але яскрава. Доўга Ганну трывожыць віна за смерць Верачкі: «Заныла, запякла думка: а можна было б дачушку ўратаваць! Магла б Верачка не ў труне ляжаць, пад важкай зямлёй, а жыць, жыць!.. Калі б не свая віна: што слухалася іх, сядзела — тады, калі трэба было хутчэй бегчы па ратунак! Не ўратавала, дала загубіць маленькую! Загубіла, можна сказаць, сама!..»

І ўсё ж Ганна, хоць і моцная гераіня, — яшчэ не стваральніца абставін; яна аб'ект мужчынскай гульні і раўнапраўная ў каханні толькі з Васілём. Астатнія вышэй за яе і па становішчы, і па багацці, і па адукаванасці. Цяжкі лёс Ганны, немагчымасць мележаўскай гераіні выбрацца на грэбень жыцця, абумоўлены найперш лёсам тагачаснай беларускай жанчыны, якой уласцівы прыродныя здольнасці, працавітасць, высокія духоўныя якасці. Але побач з гэтым суседзіць і замінае станаўленню адсутнасць адукацыі, падначаленае становішча, моцная повязь са звычаямі і стандартамі паводзін.

Зробім спробу паглядзець на праблему і з другога боку: ці магла б стаць Ганна шчасліваю дзе-небудзь далёка ад бацькі, ад Васіля, ад сваіх Куранёў? Нават тое, што І. Мележ перасяляе яе ў Юравічы, да Парасі — ужо нацяжка, бо і там яна жыве спатканнямі з мінулым — Васілём, бацькамі, Яўхімам, носіць ягонае дзіця. Характар Ганны не застылы, ён развіваецца па законах жанра, адлюстроўвае псіхалагічныя змены рэальнага жыцця. Ганну змяняе замужжа з Яўхімам, смерць дачкі. «Штосьці ў яе душы перакіпелае як бы астыла, зацвярдзела, давала ёй большай рашучасці, а другое зрабілася мяккім, вельмі чулым, падатным» — так вусцішна піша пра сваю гераіню пісьменнік. Новыя штрыхі да яе вобліку дадае потым пераезд у Юравічы і сустрэча з Башлыковым. Дзейсная жыццёвая сіла Ганны аціхае з кожным раманам «Палескай хронікі», падаючы толькі знак былой гарачасці, няўрымслівасці. Яе пачынае вабіць спакой, лес, цішыня і адзінота. Па запале, па здольнасцях той Ганны, у якую закахаўся Васіль, ніяк нельга было прадбачыць, што яна некалі стане маладой удавой пры жывым мужы, з трыма дзецьмі, на парозе вайны. Дзіўная жанчына гэтая Ганна. Каго яна кахае? Аднаго Васіля. Астатняе — толькі паслухмянае выкананне аўтарскай волі. Не ў характары Ганны мілавацца з Башлыковым і жыць з нялюбым Міканорам па суседству з адзінокім Васілём, але не па волі аўтара і пакінуць яе са Сцяпанам. Многія «белыя плямы» Ганнінай душы застаюцца нераскрытымі, пакідаючы загадку, якую аўтар нам ужо не адкрые. Вобраз Пракопавай Мані ў творы — антыпод Ганны і па знешняй прывабнасці, і па працавітасці, і па асобасных якасцях. У той жа ступені, у якой празаік захапляецца Ганнай, ён асуджае Маню.

Маня спіць, робячы, а ў Ганны ў руках работа гарыць. Васіль гаруе: «Другім, канешне, можна і не паказваць этага, а сам жа ад сябе не ўтоіш, не ашукаеш самога сябе: ці ж такую трэба жонку! Не тое што не да душы, — злосць век бярэ на яе, маруду, цяльпуху! Няўдача, а не жонка!.. Раздражнёны Васіль бачыць у паводзінах жонкі нават ганьбу для ягонай маці.

Калі ў Ганны пераважаюць дакладна вызначаныя маральныя арыенціры, Маня не лепшым чынам праяўляе сябе ў час наведвання ў бальніцы хворай Хадоські. Не скупіцца яна і на моцнае слова. Канчатковы аўтарскі прысуд гераіні вынесены І. Мележам у накідах да чацвёртага рамана, дзе пісьменнік зазначае, што Маня радуецца прыходу немцаў, якія, можа, вернуць ёй багацце, паказваючы тым самым першаснасць для яе матэрыяльных каштоўнасцяў, зноў-такі супрацьпастаўляючы яе Ганне, прагнай да пошукаў душэўнага ладу і шчасця.

Вобраз Хадоські — адзін з самых лірычных, цёплых у творы — таксама пададзены ў рамках інтымнай плыні. Яе чыста жаноцкі, пачуццёва-эмацыянальны, шчымліва наіўны і даверлівы погляд на свет, мяккае, лагоднае і прамяністае аблічча асабліва востра кантрастуюць з халодным, безуважлівым і жорсткім воблікам Яўхіма, які прадстаўляе ў творы неўтаймоўную мужчынскую сілу, а ў дадзеным выпадку безадказнасць, якой у народзе заўжды знойдзецца апраўданне. «І наогул, хіба мужчынская гэта справа — за дзеўку думаць?» Урэшце ў Канапляначкі з'яўляецца прага справядлівай адплаты за ўчынак Яўхіма, за завейную ноч у Юравіцкай бальніцы; знядоленай жанчыне здаецца, што праз смерць Верачкі на Глушака сышла божая кара: «Хадоська вострым позіркам бачыла ўсё, усё разумела, але як бы нічога не адчувала; хоць бы на міг паявілася спачуванне ў яе зеленаватых, халодных, як ільдзінкі, вачах... Быў спакой, хоць там сядзела Ганна, хоць побач груганом горбіўся той, хто даў ёй, Хадосьцы, столькі гора, хто, можна сказаць, скалечыў ёй усё жыццё. Хадоська глядзела спакойна, можа ўпершыню за гэтыя гады так спакойна: бог пакараў іх! Заступіўся за яе, пакараў за ўсё!». Для Хадоські ўсё, што людзям уласціва ўспрымаць як шчасце — каханне, нараджэнне дзяцей, — абярнулася непапраўнай бядой. Пісьменнік апасродкавана, праз згадкі куранёўцаў, адлюстроўвае, як змяніла няшчасце Канапляначку: «Яшчэ заўважылі ў Куранях, што пры такой непрыхільнасці да дарослых Хадоська аж дзіва гарнулася да дзяцей. А яшчэ злыя языкі казалі, што за ўсе гэтыя гады не было такога, каб Хадоська падышла к якой маладзіцы, у каторай было грудное на руках...»

Аўтар, апісваючы яе замілаванасць кветкамі, мякка падкрэслівае, што дзяўчына перастала верыць людзям, пазбягае шумлівай кампаніі, вячорак, засяродзілася на сваім горы і адзіноце. Нельга не заўважыць і своеасаблівых узаемадачыненняў двух персанажаў, Хадоські і Ганны, пэўнай кантрастнасці іх характараў. На пачатку твора мы захапляемся іх шчырым сяброўствам, але з развіццём дзеяння дзяўчаты становяцца ўсё больш непадобныя адна на адну. Першая па натуры — пяшчотная, пакорлівая, ласкавая, другая — незалежная і ганарлівая, першая — пакутліва плыве па цячэнню, другая ўступае ў змаганне за права распараджацца сваім жыццём з гаротнай доляй, з неспрыяльнымі абставінамі. Лёс Канапляначкі нялёгкі, але тым не менш пісьменнік больш літасцівы да яе, чым да Ганны. У рамане «Подых навальніцы» чытач бачыць, як Хадоська акрыяла пасля свайго цяжкага дзявочага гора. Яна доўга пакутуе ад таго, што адчувае віну перад усім перажытым, і пісьменнік у рэшце рэшт дорыць гэтай гераіні хронікі каханне і адданасць Хоні, якія лечаць яе душэўныя раны. Чаму дзяўчына так упарта рухаецца па дарозе свайго лёсу? Ці не спрадвечная вера ў прадвызначанасць Богам кожнага дня жыцця, у нядобрую долю, у адчайную бездапаможнасць перад злымі языкамі цягнула Хадоську ў глінішчанскую багну? Што ж, можна абвінавачваць Канапляначку ў сляпым падпарадкаванні наканаванаму, але гэтае цячэнне жыцця, па якім яна плыве, выносіць Хадоську, у адрозненне ад упэўненай Ганны, да асабістага шчасця.

Прыватна-сямейная плынь сюжэтыкі ў творы таксама дастаткова выяўлена: і Алена Дзятлікава, і Ганніна маці-нябожчыца, і Глушакова Куліна. Усе гэтыя жанчыны — надзвычай каларытныя, адметныя постаці.

Вобраз цёткі Алены, прынамсі, уяўляе сабой яркі прыклад жаночага светапогляду і ладу жыцця, што сфарміраваліся ва ўмовах патрыярхальнай беларускай вёскі. Сэнс яе існавання — служэнне бацьку, потым мужу, затым сыну — а канкрэтней, сям'і і яе гаспадару, мужчыну. Прынцып жыцця цёткі Алены — саступаць, улагоджваць, супакойваць, мірыць, дагаджаць, спачуваць, г. зн., забяспечваць станоўчы, спрыяльны і ствральны мікраклімат у сям'і і, наогул, вакол сябе, што асабліва праяўляецца ў эпітэтах, якія выкарыстоўвае І. Мележ для абмалёўкі гэтага жаночага вобраза: сама яна «маўклівая, паслухмяная», «у складцы яе родных губ выраз нейкага шкадавання і вінаватасці». Найбольш увагі аўтар надае позірку, вачам маці. Прынамсі, у эпізодзе, калі Дзятліха наведвае сына ў турме, аўтарскае пачуццё да сваёй гераіні прарываецца ў цэлым феерверку трапных псіхалагічных эпітэтаў: «Маці, якая сядзела ўскрай услончыка, не зводзячы добрых вачэй з яго (Васіля. — *І. В.*), хапаючыся, узнялася, стала ў замяшанні. Так і стаяла, маўклівая, і толькі вочы, насцярожаныя, чулыя, павільгатнелыя, поўныя вялікага шкадавання, казалі, што робіцца ў яе душы».

Нягледзячы на нібыта прыніжанае становішча, у якім знаходзіцца цётка Алена, пісьменнік паказвае яе з ціхім замілаваннем, нават узвышана, апяваючы спагадлівасць і ахвярнасць гэтай палескай жанчыны, характар якой асабліва выразна праяўляецца ў момантах, калі яна дзеліць з сынам душэўныя пакуты ў час зняволення, бароніць яго ад раз'юшанага Яўхіма ў памятнай бойцы за зямлю ля цагельні. Мележ часта падкрэслівае, што нямарныя былі яе ахвяры і клопаты, паказваючы, як мацярынскае шчасце выяўляецца ў гордасці за свайго ўзмужнелага, дарослага, працавітага, ёю выхаванага Васіля. Калі сын косіць, яна «пазірае яму ўслед, ласкавая і гордая, і ад гэтага ў руках і нагах сілы быццам большае». Вобраз Алены Дзятлікавай

для І. Мележа — увасабленне ахвярнага пачуцця мацярынства, непрыкметнага, ціхага і ўсеабдымнага. І тут на першым плане праступае ўжо культурна-хрысціянскі ідэал маці і мацярынства.

Вобраз жа Ганнінай маці-нябожчыцы мае ў творы, на наш погляд, іншую, але тым не менш значную сэнсавую нагрузку. Празаік згадвае яе, калі апісвае найбольш важныя моманты Ганнінага жыцця. Упершыню ўспамін пра маці-нябожчыцу ўзнікае ў лірычным аўтарскім маналогу, калі Ганна пасталела і выбіваецца на дзяўчо, напрыклад, там, дзе дзяўчына параўноўваецца з рабінай: «Часам успаміналі Ганніну маці-нябожчыцу, казалі, што дочка ва ўсім выйшла ў матку. З аблічча — дык як вылітая...» Гэты напамін звязаны з момантам росквіту дзявочай прыгажосці, з самым шчаслівым часам у жыцці Ганны. Прыгадаем, што ў «Подыху навальніцы» аўтар стане параўноўваць яе душу, як гэта было калісьці ў Ядвігіна Ш., з бярозкай: «Бяроза ўжо дажывала век. Вецце яе было ўжо найбольш пасохлае, там і тут вятры абламалі галіны, ствол чарнеў старэчай карою... Ад гэтай бярозы Ганне стала яшчэ страшней. «Ето ж — я сама! — пранізала яе думка. — Такая ж і я!..»

Яшчэ адна згадка пра памерлую матулю, якая, відаць, не дапусціла б такога здзеку з дачкі, прымеркавана да драматычнай падзеі у жыцці Ганны — невясёлага вяселля. Роспач ад бездапаможнасці ў такіх складаных жыццёвых абставінах, калі падтрымка маці так неабходна, а яе няма, перадаецца і Ганне. Але дзяўчына прывыкла прымаць удары лёсу, і не дазваляе сабе самашкадавання. Светлы вобраз роднай маці, відаць па ўсім, захоўваецца ў адным з тых нямногіх куточкаў Ганнінай памяці, дзе яна можа адпачыць душой.

Калі стары бацька непакоіцца за Ганну ў час калектывізацыі, ён, успамінаючы нядобрае замужжа дачкі, зноў згадвае яе нябожчыцу-матку.

Семантычна вобраз Ганнінай маці вельмі набліжаны да вобраза Алены Дзятлікавай, але заключае ў сабе яшчэ большую ступень абагульнення ў выяўленні духоўнай сутнасці мацярынства.

Вобраз жанчыны, што традыцыйна ўспрымаецца і як увасабленне аб’екта кахання і як прыклад самаадданага мацярынства, у творах Мележа адначасна з’яўляецца і ўзорам вернасці народным ідэалам дабра і справядлівасці. Фальклорны вобраз жанчыны прадугледжвае яшчэ адну, іншую, ужо цёмную, іпастась жанчыны — вядзьмарка, русалка, злая мачыха. Апазіцыя «маці — мачыха» выразна праяўляецца не толькі ў вуснай народнай творчасці, але і ў многіх мастацкіх творах: у адных як пацверджанне, у другіх — як абвяржэнне фальклорнай традыцыі. І. Мележ у гэтым плане не ідзе насуперак народнаму ўяўленню пра няродную маці і паказвае другую Чарнушкаву жонку Куліну няшчырай, крывадушнай, з прыхаванай думкай пра свой уласны інтарэс. У Чарнушкавай сям’і, як кажуць, «кукарэкае курыца», і падобна на тое, што Ганнін бацька махнуў рукою на такое становішча. Магчыма, ён стаміўся ад дробных сварак, вечнай незадаволенасці жонкі. Ганна таксама не ўступае ў спрэчкі з мачыхай — гэта бессэнсоўна, бо бацька з дачкою жывуць у іншым вымярэнні, дзе сквапнасць да грошай, імкненне пабагацець, схітрыць не знаходзяць месца.

Мачыха фактычна прадае Ганну ў час сватання Яўхіма, патрабуючы ад яе вялікай ахвяры быццам бы дзеля сям’і. Хаця гэта і натуральна — любіць сваіх дзяцей, але ж не за кошт чужых. Падобна таму, як жонка Васіля Маня супрацьстаіць у творы яго каханай Ганне, так і Ганніна маці-нябожчыца выступае антыподам мачыхі Куліны. Агульныя рысы назіраюцца таксама ў лёсах Васілёвай Мані і Глушачыхі. У раманах «Палескай хронікі» шляхі Глушачыхі і Мані не перасякаюцца, але падабенства іх лёсаў заўважаецца адразу. Па-першае, Васіль Дзяцел і стары Глушак падобныя ў поглядах на стварэнне сям’і — гаспадарчы разлік пераважае над эмацыянальнымі праявамі. Глушак узяў за сябе няўдаліцу Куліну з-за бацькаўшчыны — палоскі зямлі, прадаўшы якую, ён прыдбаў лапік ля цагельні. Васіль таксама выбраў сабе ў жонкі дзяўчыну з заможных, прываблены яе багатым пасагам. Зрэшты, усё гэта вынік псіхалогіі неабходнасці, якая панавала ў небагатых і нават у заможных сем’ях і давала магчымасць выжыць і пракарміцца. Цікава, што яўна негатыўна маркіраваны Яўхім не спакушаецца такім утылітарна-разліковым падыходам і бярэ сабе жонку паводле сардэчнай прывязанасці.

Выразна, дэталёва выпісаная пісьменнікам Глушачыха ў творы моцная найперш сваёй фанатычнай прывязанасцю да сям’і; жанчына без памяці любіць сыноў, што асабліва пераканаўча паказвае эпізод арышту Яўхіма: «Больш Міканору не ўдалося стрэліць. Раз’ятраная Глушачыха, затульваючы сына, раскінуўшы рукі, рушыла на яго».

Паказальны і такі момант, калі малодны сын Сцяпан угаворвае маці ўступіць у камуну, жанчына бачыць у гэтым здраду мужу, сям’і і годна адказвае: «Разам звекавалі. Разам дажываць будзем». Вобраз гэтай жанчыны ў рамане «Завеі, снежань...» з’яўляецца выразным праяўленнем спрадвечных культурных канонаў патрыярхальнай вёскі, яе маральна-этычных норм.

Сацыяльную плынь у трылогіі прадстаўляюць і шмат другарадных, часам эпізадычных вобразаў: Адар'я Дамеціха, удава Сарока, настаўніца Параска, швачка Годля, гаспадыня Цыля. Да прыкладу, Адар'ю Дамеціху напаткаў цяжкі лёс: пяцёра сваіх дзетак, як і Зайчыкава жонка, яна перавезла на могілкі. Бедавала ў халоднай хаце з гнілымі падвалінамі, расцягваючы чорную муку да першай травы. Жыццё навучыла яе трываць, цярпець, чакаць горшага і радавацца, калі яно не наступіць. Дапамогі асабліва чакаць не было адкуль — і яна, як і ўсе ў Куранях, чакала яе з неба. Вера ў Бога дапамагала людзям выжыць, у горы — акрыяць душой, не паддацца адчаю, з ёю ў цёмныя хаты палешукоў штогод завітвала надзея на «новае лета, на добрае жыта». Бог, мабыць, адзін, хто заставаўся з імі на балоце, калі яно адразала вёску ад свету. Вянчанні, Каляды, іншыя святы — «а ці ж не спектакль для іх гэта, — разважае малады Дамецік, — не кіно, калі пра тое кіно да яго, Міканора, гаворак яны і чуць не чулі нічога!»

Багоў не мяняюць, тым больш жанчыны — тая палова чалавецтва, якая заклікана захоўваць і перадаваць наступным пакаленням нацыянальную памяць, а значыць, і рэлігію. Малады Міканор яшчэ не мае такога вопыту ў перакананні людзей, як, скажам, Апейка, і намагаецца пераадолець бар'ер з наскоку, адразу зламаць старыя звычкі. І ён пачынае са сваёй хаты. Мудры аўтар не палемізуе з Дамецікам у адкрытую, але ён выбірае і апісвае такія моманты куранёўскага жыцця, якія б адлюстроўвалі не столькі цемнату і фанатычную веру палешукоў, колькі народную мараль, увасобленую ў па-свойму зразуметых імі законах Божых, традыцыйную абраднасць, нацыянальны лад жыцця. Таму, думаецца, І. Мележ усё ж аддае перавагу пазіцыі старой Дамеціхі. Невыпадкова менавіта яна часта ўключаецца ў абмеркаванне самых што ні ёсць палітычных, надзённых, «нежаночых» пытанняў. Дамеціха і Апейка — натуры падобныя. Вуснамі Дамеціхі гаворыць аўтар, калі Апейкі няма. У яе словах, як у клятве Гіпакрата, гучыць лейтматывам — не нашкодзіць. «Жаночы падыход» Адар'і да стварэння калгаса і да раскулачвання, адносіны да свайго брата Глушака і проста да суседа — «па-добраму каб», «па-людску» — характэрны і Апейку. Гэтае «бабскае», якое можна называць «жаночым падыходам», «жаночай логікай» — лепш па-боску, лепш недапакараць, чым перагнуць, бо любы чалавек мае права жыць, у кожнага павінен быць шанц, што, урэшце, з'яўляецца сапраўднай праявай гуманізму, чалавекалюбства.

«А толькі, я так думаю... па-божаму... Па-людску так трэба: жывіце і другім жыць давайце.» «Па-людску рабіце!.. А як бы твайго бацька, да тваю матку — пад корань! Да дзяцей бедных, не вінаватых ні ў чым перад богам!» — не стамляецца паўтараць гераіня І. Мележа ў накідах да раздзела «Жыццё ў мястэчку».

Фактычна ў размове з маці выкрываецца і Міканорава прасталінейнасць, і яго ачмуранасць новымі жорсткімі павевамі. Яна, маці, намагаецца вярнуць сына да адчування рэальнасці.

Вобраз Дамеціхі ў раманах «Палескай хронікі» — не столькі ўвасабленне сляпой, інстыктыўнай мацярынскай любові, як, скажам, вобраз Глушачыхі, а хутчэй праваднік гуманістычнага, хрысціянскага светапогляду аўтара. Таму і статус мележаўскай гераіні ў творы не прыватна-лакальны, як, напрыклад, маці Васіля, а канцэптуальны, філасофскі.

Удава Сарока, як і Дамеціха, прадстаўляе значны сацыяльны пласт жаночых вобразаў і найчасцей прыгадваецца ў сувязі з разважаннямі вяскоўцаў пра стварэнне калгаса, пра спосабы і мэты ўваходжання ў новае жыццё, у час калектыўнай будоўлі грэблі і выбараў старшыні. Характэрна, што гуманістычныя ідэалы для яе такія ж вызначальныя, як і для Дамеціхі. Нягледзячы на свае даволі прагрэсіўныя для таго часу погляды, гэтая жанчына не разумее сацыяльныя змены як падставу для знішчэння чалавека і прымае да сябе ў хату раскулачаных Глушакоў (накіды «Завеі, снежань»). Да сацыяльна значных вобразаў мележаўскай творчасці можна аднесці і вобразы яўрэйскіх жанчын. В. Ляшук, цытуючы ўспаміны І. Мележа ў кнізе «Іван Мележ у школе» (Мн., 1981), паказвае, што вобраз швачкі Годлі, як і Зайчыка, і Нохіма, у рамане рэальны, нават імя не зменена. Вобраз гэтай жанчыны настолькі натуральна ўпісаўся ў мастацкую тканіну твора, што не ўзнікае ніякіх сумненняў у мэтазгоднасці ўключэння гэтага персанажа ў сюжэтную канву. Менавіта дзякуючы такім персанажам, як Годля, пісьменнік разважае над лёсам збяднелага беларускага яўрэйства.

Годля, якая жыве з выпадковага заказу, часта не знаходзіць прымянення свайму, відаць, не абы-якому ўмельству, але бярэцца за любую работу. Злая доля пазбавіла яе сям'ю кармільца, узняла яе з наседжанага месца і занесла ў палескае балота, разам з малымі і старэйшымі дзецьмі, якіх трэба пракарміць, выгадаваць, вывесці ў людзі. Толькі пазней, у рамане «Завеі, снежань», мы бачым Годлінага чалавека, які вярнуўся, — ціхага, «далікатнага» Элю. Асаблівую ўвагу звяртае аўтар і на праніклівасць, назіральнасць яўрэйскіх жанчын.

У рамане «Завеі, снежань», сустрэўшыся з яўрэйкай Цыляй — гаспадыняю кватэры, дзе жыве Башлыкоў, мы зноў падзівімся яе асаблівай праніклівасці.

Увогуле, яўрэйскія жанчыны ў творах І. Мележа паказаны не толькі традыцыйна хітраватым, або крыху сквапнымі, а наадварот, моцнымі, здольнымі замяніць у сям'і і грамадскіх справах ціхіх рахманых мужоў.

Звернем увагу і яшчэ на адзін вобраз студэнткі Парaскі. У першым рамане «Палескай хронікі» чытач сустракацца з ёй толькі адзін раз — калі Параска купляе бульбу ў Чарнушкі. Але ўжо гэтага дастаткова, каб гераіня добра запомнілася. Нават па простым, здавалася б, яе пытанні адносна Ганнінага жаніха: «Вы любіце яго?», якое выкрывае непапраўную несправядлівасць, якая адбываецца ў жыцці дачкі Чарнушкі. Для Параскі самым важным з'яўляецца ўнутраны, духоўны сэнс чалавечага існавання. Ёсць у будучай настаўніцы і выразная грамадзянская пазіцыя — яна цвёрда вырашыла для сябе прыехаць на працу ў глухую вёску. Як і коласаўскі Андрэй Лабановіч, гераіня Мележа не грэбуе неадукаванымі палешукамі, а імкнецца несці ім праменьчык асветы.

Як Апейка і Міканор, Параска ў творы І. Мележа — прадстаўніца новага, будучага жыцця, таму невыпадкова па працягу трылогіі мы яшчэ ўбачым, што менавіта да яе звернецца Ганна па дапамогу, калі назаўсёды пакіне Глушакову хату.

Настаўніца ў творы І. Мележа надзелена прывабнымі чалавечымі рысамі, але яе вобраз рафінавана сацыяльны і нечым нават нагадвае Веру Засуліч з рамана М. Зарэцкага «Вязьмо» — вясёлая, жвавая, аптымістычная мясцовая актывістка, закаханая ў свайго начальніка, ставіць па вечарах агітп'есы, выступае на сходах. Напачатку яе характар мае выдатныя перспектывы для развіцця, але ў наступных раманах выяўляецца пераважна знешне і нематывавана.

Такім чынам, выяўляючы ў раманах «Палескай хронікі» нацыянальны тып беларускай жанчыны, І. Мележ найперш абмалёўвае яе ў традыцыйных праявах і прыватна-сямейных адносінах. Каханая дзяўчына (Ганна, Хадоська) і маці (Васілёва маці, Хонева маці, маці Алеся Маёвага) разглядаюцца аўтарам як выразніцы лепшых рысаў характару беларускі.

Народнаму пісьменніку ўдалося выявіць менавіта народны тып жанчыны, абмаляваць, падаць яго адпаведна нацыянальным уяўленням беларусаў, шматпланава раскрываючы ў разнастайных індывідуальных праяўленнях. Жаночыя вобразы, створаныя І. Мележам, пазбаўлены схематызму і прасталінейнасці, аднатыпнасці альбо шаблоннасці, але яны прывабныя ў сваёй тыповасці і глыбокай роднасці з рэальным беларускім характарам.

Паставіўшы жанчыну ў кантэкст грамадска-гістарычных змен, выявіўшы яе гуманістычны падыход да чалавека ў русле любых сацыяльных калізій, празаік змог паказаць такія істотныя рысы беларускай жанчыны, як справядлівасць, дабрачыннасць, хрысціянскае чалавекалюбства і ахвярнасць.

Чарнобыльская катастрофа адабрала ў беларускага народа прыпяцкае Палессе, і яго жанчыны — носьбіткі унікальных мясцовых традыцый — аказаліся расселенымі па ўсёй краіне, коштам сваіх разбітых лёсаў узбагаціўшы Беларусь непаўторным палескім менталітэтам.

Такім чынам, проза І. Мележа дагэтуль застаецца адной з найгалоўнейшых літаратурных крыніц, дзе ў вышэйшай ступені таленавіта занатавана ментальнасць палескага рэгіёна, выяўленая ў вобразах беларускіх жанчын.